**Чалавек – гэта цэлы свет**

**Канстанцін Мікалаевіч Ільюшчыц** – беларускі паэт член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Пасля заканчэння школы паступіў ў тэхналагічны інстытут, атрымаў спецыяльнасць інжынера-механіка. У гэтым жа годзе Канстанцін Ільюшчыц быў прызваны ў рады Савецкай Арміі, з якой і звязаў свой лёс. Закончыў Усурыйскае ваеннае аўтамабільнае каманднае вучылішча. За гады ваеннай службы Канстанцін Мікалаевіч пабываў у Сібіры, Казахстане, у Германіі, але сэрца і думкі былі з Беларуссю У 1992 годзе вярнуўся на Радзіму, у Мінск, дзе жыве і цяпер. Узнагароджаны ордэнам “Знак пашаны”, медалямі.

Друкавацца Канстанцін Ільюшчыц пачаў у раённай газеце “Шахцёр” (г. Салігорск). Але пачаткам творчасці лічыць 1965 год, калі ў газеце “Літаратура і мастацтва” з’явілася першая падборка яго вершаў (паэту было 18 гадоў). Вершы кранаюць свежасцю і шчырасцю. Яны напоўнены паэзіяй роднай прыроды, роднага кутка, роднай мовы.

У 1977 годзе ў свет выйшаў зборнікі вершаў паэта “Армейскія будні” і “Таёжны гарнізон” (1982г.). Асобныя творы Канстанціна Мікалаевіча Ільюшчыца перакладзены на рускую, украінскую, польскую, грузінскую мовы. Свій фотаздымак і зборнік вершаў падараваў Літаратурнаму музею СШ №3 г. Салігорска.

Пад варожай навалай,
Чужаземнаю змовай
Не жыла – вымірала
Мая родная мова.

Горла ціснуў нам туга
Час вяроўкая пяньковай,
Каб хадзіла ў прыслугах
Беларуская мова.

Уваскрэсла з нябыту,
Як уток і аснова,

Як жыццёвы набытак,
Беларуская мова.

Хай крынічкаю весняй,
Хай завеяй зімовай
У душы гучыць песняй
Мая родная мова.

Каб, як маці, ашчадна
Шанавалі мы Слова
Для мяне, для нашчадка,
Стань – НАРОДНАЮ, мова!

**Георгій Міхайлавіч Шундрык** нарадзіўся ў в. Задвор'е Слонімскага раёна ў 1936г. Праз некалькі гадоў бацькі пераехалі ў в. Сцяткоўшчына Дзятлаўскага раёна.

Закончыўшы пачатковую школу, а затым "семігодку", паступіў у Навагрудскае педвучылішча. З 1954 года на працягу чатырох гадоў працаваў у школах Казлоўшчынскага раёна.

Пасля арміі 10 гадоў быў выхавальнікам у Дзятлаўскай школе-інтэрнаце, арганізаваў духавы аркестр, вёў гурткі. Закончыўшы геаграфічны факультэт БДУ, выкладаў геаграфію ў СШ № 2 г. Дзятлава на беларускай мове, якая, як кажуць, была адзінай у раённых цэнтрах Беларусі.

Вопыт папярэдніх гадоў, хібы, недарэчнасці і супярэчнасці жыцця хвалявалі, застаўлялі задумвацца, рэагаваць. Так і з'явіліся выдатныя вершы, а затым і пераклады. Сам Георг Міхайлавіч аб сваёй творчасці кажа так: "Мае вершы – у некаторай ступені выхаваўчыя. Мне хочацца праз свае вершы данесці ўсё самае лепшае да нашчадкаў, можа ў нейкай ступені праз свае адчуванні".

У 2006 годзе Георгу Міхайлавічу споўнілася 70 гадоў. У Дзятлаўскай раённай бібліятэцы адбыліся ўрачыстаці з нагоды юбілею паэта. Шмат у гэты дзень прагучала добрых слоў і шчырых пажаданняў. Павіншаваць юбіляра

сабраліся літаратары, блізкія людзі. Свае словы віншавання і навялікі верш -“ У вянок юбіляру”- прысвяціў Мікола Грышан:

Як і у 25, у 70
Будзь маладым душою, брат.
Як жыў спрадвек, жыві сумленна
І чэрпай шчасце поўнай жменяй.

Каб не зламалі Цябе буры,
І твар заўжды не быў бы хмурым,
Каб цешыліся мы Табою,
Ты кроч з узнятай галавою.
А да ўсяго скажу, нарэшце:
Жыві гадоў 100, а то і 200.

Вядомы не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі літаратуразнавец, крытык, кандыдат філалагічных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі **Вячаслаў Антонавіч Чамярыцкі** нарадзіўся ён у 1936 г у маляўнічым кутку Дзятлаўшчыны на беразе р. Ятранкі ў в.Рабкі ў беднай сялянскай сям’і. У 1938 г. яго бацькі пераехалі ў Навагрудак.

Вучыўся ў Навагрудскай СШ №1. У 1958 г. Вячаслаў Антонавіч скончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў настаўнікам, інспектарам аддзела народнай асветы Маладзечанскага раёна. У 1965 г. скончыў аспірантуру, абараніў кандыдацкую дысертацыю “Беларускія летапісы як помнікі літаратуры”.

З 1965 г. працуе ў Інстытуце літаратуры, старшы навуковы супрацоўнік, з 91-га года ўзначальвае аддзел гісторыі старажытнай і новай беларускай літаратуры.

Першая спроба пяра В.Чамярыцкага адносіцца да пачатку 1950-х г. Гэта былі вершы аб роднай прыродзе, Радзіме. У 1952 г. у навагрудскай раённай газеце “Новае жыццё” быў надрукаваны яго першы верш “На лыжах”. Усяго апублікаваў у мясцовым і рэспубліканскім друку каля 20 вершаў.

Падрыхтаваў да друку і ўпершыню апублікаваў каштоўны помнік беларускага пісьменства XVII – XVIII ст. – Магілёўскую хроніку.

В.Чамярыцкі ўзнагароджаны медалём Ф.Скарыны, граматамі Прэзідыума НАН Беларусі. В. Чамярыцкі часта сустракаецца са студэнтамі – філолагамі, удзельнічаў у канферэнцыі, прысвечанай 500-годдзю нараджэння Ф. Скарыны.

**Мікола Грышан** нарадзіўся 12 лютага 1933 года ў в. Чэрніхава паблізу Баранавічаў. Скончыўшы сярэднюю школу ў Баранавічах, паступіў у настаўніцкі інстытут, затым педінстытут імя Янкі Купалы ў г. Гродна. Першы друкаваны верш з’явіўся ў “Баранавіцкай газеце” у 1942 г. З 1950 года пачаў супрацоўнічаць са многімі газетамі. Свае вершы друкаваў у раённай газеце “Перамога”, “Настаўніцкай газеце”, “Беластоцкай газеце”, “Ніве”. З 1952 па 1993 год працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў в. Раготна Дзятлаўскага раёна. Цяпер пенсіянер. З’яўляецца членам раённага літаратурнага аб’яднання “Пралеска”.